Аляксей
# ЧУБАТ

# ГЛІНЯНЫ ЧАЛАВЕК



Аляксей
# ЧУБАТ

# ГЛІНЯНЫ ЧАЛАВЕК

ВЫДАВЕЦТВА
ГАЛІЯФЫ



Другі фронт мастацтваў

Аляксей Чубат

# Гліняны чалавек

Вершы

Мінск
«Галіяфы»
2008

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
Ч 81

Серыя заснаваная ў 2000 годзе.

Рэдакцыйная калегія серыі:

Зміцер Вішнёў (галоўны рэдактар), Міхась Башура,
Валянцін Акудовіч, Ілля Сін

**Чубат, А. Л.**

Ч 81 Гліняны чалавек : вершы / Аляксей Чубат. — Мінск : Галіяфы, 2008. — 78 с. — (Другі фронт мастацтваў).

ISBN 978-985-6906-09-4.

Вершы Аляксея Чубата адметныя і розныя не толькі ў сэнсава-тэматычных, але і ў фармальна-жанравых адносінах (трох-, пяцірадковыя мініяцюры і разгорнутыя, з некалькіх частак, тэксты, верлібры). Пры скрайняй арганічнасці яны, за асобным выключэннем, адпавядаюць тым падыходам і крытэрыям, якія і вызначаюць месца паэта ў наш складаны тэхнагенны час.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-6906-09-4**
© Чубат А. Л., 2008
© Афармленне. ПВУП «Галіяфы», 2008

## ЯКІЯ КВЕТКІ ШУКАЕМ...

У свой час, у першым нумары часопіса «Полымя» за 1967 год (вунь як даўно!), я надрукаваў нататкі пра першыя зборнікі маладых паэтаў. І назваў іх (нататкі) рашуча: «Верш твой — споведзь твая». І не проста разбіраў, ацэньваў так ці іначай вершы пачаткоўцаў, але адначасова спрабаваў вызначыцца з крытэрыямі ацэнкі, высветліць, у тым ліку і для сябе самога, што гэта за феномен такі — вершаваны твор, якім ён мусіць быць, каб стаць сапраўдным мастацкім словам, атрымаць права на прызнанне, на чытача, чым вызначаецца паэтычны талент і г. д. І праходзіў да пэўных высноў. Не пагаджаўся, па-першае, што немагчыма часам адрозніць таленавітае ад няздарнага. «Выходзіць, — пісаў я ў запале, — што папяровыя кветкі цяжка адрозніваць ад жывых? Ніколі не паверу! Ёсць адна яўная, я б сказаў, відавочная прыкмета таленту. Гэта — арганічнасць. Талент — з'ява арганічная. І, як усякая арганічная з'ява, ён непаўторна асаблівы, мае свае адметныя воблік і голас. Ніводная жывая былінка не падобная абсалютна на іншую, такую ж як быццам былінку». Далей, прадаўжаючы дзяліцца назіраннямі над вершамі маладых, параўноўваючы іх аднаго з другім, я зазначаў, што першая кніга — гэта своеасаблівае «пасведчанне асобы», што аўтар пакліканы быць у сваіх творах самім сабой:

са сваім унутраным светам, сваім характарам, сваімі поглядамі і перакананнямі. Гаварыў яшчэ і пра тое, што праблема формы, мастацкай выразнасці — гэта таксама ў канчатковым выніку праблема арганічнасці, праблема асобы ў паэзіі. Бо, як вядома, стыль — гэта чалавек...

Чаму, з якой прычыны я стаў згадваць тыя, амаль саракагадовай даўнасці, нататкі? У сувязі з патрэбай пазнаёміцца з рукапісам першай кнігі вершаў Аляксея Чубата і напісаць да яе прадмову.

Прызнацца, пачынаў знаёміцца не без пэўнай насцярогі, нават недаверу. Што, я думаю, зразумела. Бо, па-першае, у наяўнасці розныя, так бы мовіць, узроставыя катэгорыі, а значыць, пэўна, і розныя густавыя крытэрыі. Па-другое — што, можа, нават больш істотна, — амаль відавочны факт з'яўлення часам у сённяшняй маладой паэзіі не столькі насамрэч творчага, колькі, мякка кажучы, версіфікатарскага актывізму, літаратурнага штукарства... Дык вось, словам, стаў чытаць вершы выпускніка факультэта журналістыкі БДУ, дваццацівасьмігадовага Аляксея Чубата, вершы, як высвятлялася, адметныя і розныя не толькі ў сэнсава-тэматычных, але і ў фармальна-жанравых адносінах (трох-, пяцірадковыя мініяцюры і разгорнутыя, з некалькіх частак, тэксты, верлібры). Чытаў, знаёміўся і паступова пераконваўся, што насцярожанасць мая ў дадзеным выпадку была

неапраўданай, што вершы, за асобным выключэннем, адпавядаюць тым падыходам і крытэрыям, пра якія вышэй ішла гаворка і якім, прызнаюся, я застаюся верным і па сённяшні дзень. Хаця, дапускаю, і не ўсё ў іх бясспрэчнае.

Справа ў тым, што Аляксей Чубат не выдумляе, не «канструіруе» свае творы. Яны ў яго, мяркую, з'яўляюцца ў выніку то ўнутранага імпульсу, пэўнага эмацыянальнага штуршка, то жывога назірання, то спробы па-філасофску асэнсаваць тую альбо іншую з'яву. Яны ў яго, так бы мовіць, жыванароджаныя. Накшталт тых кветак, пра якія сам піша ў цікавым вершы-прыпавесці «Цыкл»:

Хтось вечна шукае кветак
На рынку, у садзе, на полі,
Жывых, арганічна прыгожых,
Прывабных і стромкіх даволі...

Апрача слоў «жывых, арганічна прыгожых» вылучаю ў гэтай страфе і яшчэ адно слова — «шукае». Ключавое, не выпадковае. Бо адно з уражанняў, якое пакідаюць вершы Аляксея Чубата, — тое, што мы маем справу з аўтарам-шукальнікам. Пра гэта, дарэчы, сведчыць і яго імкненне па-свойму інструментаваць фанетычна і інтанацыйна вершаваны радок, пазбягаць, у прыватнасці, банальнай, беднай рыфмы. Ён шукае новыя сугуччы, што, безумоўна,

спрыяе пошуку жывой (у адрозненне ад штучнай) кветкі.

Дабраслаўляю гэтай прадмовай «крывіцкага нашчадка» (словы паэта) Аляксея Чубата ў нялёгкую як у прафесійных, так і ў духоўных адносінах дарогу па краіне, назва якой — Паэзія.

*Анатоль Вярцінскі*

* * *

Тыдзень дарогі праз паў-Беларусі,
Тыдзень дажджоў і тыдзень сустрэч
Да твайго сэрца.

Праз сто шляхоў да цябе дабяруся,
Вырвуся, толькі б абняць твае плечы.
Не? Лепш памерці!

Ну не глядзі з тугой, не маўчы!!!
Не апускай у магілу жывога —
Так невыносна!

Верыш? Калісь паляцім ў далячынь мы —
Толькі б нам крылы, а гэта трывога
Будзе як коска.

* * *

«Малая радзіма», —
Гаворым;
Ды толькі чамусьці яна
Займае большую частку
Нашага сэрца.

* * *

Белыя плямы кефіру
На дарозе
Маласнежнай зімы.
Стромыя вежы Міру,
Глейкія паплавы.
Вяртаемся з выраю
Мы.

## ПЛЕНЭР

Па зямлі, па восеньскай лістоце
Босыя акторы танчаць вальс.
Гледачы — пачвары на балоце,
Непаразуменне, твары — маскі.

Ды не ўбачыць шэраму натоўпу,
Што з-пад елак вылез і з-пад лаў,
Што ў вадзе акторы ногі топяць
Не з блазенства ў спробе лёгкай славы.

На жыццё натоўп глядзіць з пагардай —
Бо той крык жыцця, што піск слаты;
Можа, ўзяць ды ціха, дзеля жарту,
Выліць у калюжу кіслаты?

## БРЭСЦКІЯ КАШТАНЫ

Холад. Пустэча. З лістоты дыван.
Суччам чапляе аблокі каштан.
Дзетак сваіх паскідаў на зямлю,
Быццам разынак рассыпаў. Люблю

Браць іх на рукі. На сонцы блішчаць
Глянцам калюжын. Кішэнь набіваць
Можна бясконца, ды толькі, на жаль,
Хутка завершыцца восеньскі баль.

## РАЗВАДНЫ КЛЮЧ І КАШТАНЫ

Ногі спусціў у ваду,
Галава пад дажджом,
Іржою пакрыўся.

А некалі плюшчыў
Бліскучыя гронкі,
Ўганяў у асфальт
Вадзяное нутро;
Цяпер яны побач,
Такія ж, як ты,
Забыты у лужы,
І колер такі ж іх,
Ды толькі — жывыя.

## ПРАВІНЦЫЙНАЯ ВОСЕНЬ

Дрэвы паціху лушчацца,
Кіпнем дажджоў пабітыя.
Ліст сапрэлы варушыцца,
Ветрам на сцежцы забыты.

Гмах заблукаў у тумане,
Стаіць і гаротна плача.
Навокал асенняе ранне,
Праменьчык па лужах скача.

Дым ад смецця палёнага
Уедна ноздры казыча.
Горад, усё яшчэ сонны,
Сваё мяняе аблічча.

Хутка людскія крокі
Цішы ідылію зганьбяць.
Яна застанецца далёка
Ў падворку нашае памяці.

* * *

*А.Б.*

Такі халодны дзень.
Зямля пад шкарлупой.
Ад дрэваў чорны цень
Наводзіць неспакой.

Цябе не адшукаў
За морам залатым,
Цябе не маляваў
Маіх паходняў дым.

Стракаты крыгарух —
Жыццё у бігудзях...
Тваіх вачэй уздых
Адчуў я на грудзях.

Сякеркаю малюе
Непрадказальны лёс:
І ніткай не зашыеш,
Не з'едзеш на калёсах.

Я бачыў — гэта сумна,
Памножана на боль.
Жыццё праходзіць тлумна:
Падводзім рысу — ноль.

Сляпенькі варажбіт
Не зменіць шлях людзей;
Уплёўшы ў кветкі жыта,
Прыйду я да цябе.

Такі халодны дзень,
Зямля пад шкарлупой...
Давай з табой падзекаем
Насычана, па-свойму.

## ВЯРТАННІ

Вакзальны тлум працяжны і цяжкі
Да долу цісне і вярэдзіць пахам.
З вагонаў цэментовыя мяшкі
Рабочыя скідаюць з шумам-гахам.

І кожны ўдар — сцізорыкам пад дых,
Як помста ад Кутка Ажыны Спелай;
Мне крыўдна, але хто з нас быў святы
Або жыццё пражыў занадта ўмела?

Цягнік паціху коціцца й гудзіць,
Абдаючы нас парай прывітання.
Штурхнуць у роў яго, хутчэй спаліць,
Каб не было шчымлівага расстання?

Ды марна ўсё, бо кожны мроіць край,
Куды ідзе цягнік, ад сонца белы,
Дзе будзе жыць, дзе будзе плёс Гавай,
Дзе будзе сніцца Кут Ажыны Спелай.

## ПОШУК

У далёкіх краях,
На нябачаных землях,
На шырокіх праспектах
Сусветных сталіц,
Дзе няма нас,
Вось-вось дзе павінны з'явіцца,
У палацах мастацтваў
Не з цэглы, а з кніг,
У наступнай сустрэчы,
Што будзе праз тыдзень,
На прыпынку аўтобусным,
Нават у сне
Мы шукаем каханне
Паўсюль,
Куды прыйдзем,
Добрым вокам сціскаючы
Шкельца пенснэ.
А каханне,
Вялізнае (больш за «Тытанік»),
Трапяткое, пяшчотнае,
З прагай кахаць,
Не далёка на поўдні,
Ў трапічных абшарах,
А вось тут — дакраніся,
Не трэба шукаць.

* * *

*С. С.*

*...а з усіх сяброў толькі ён*
*адзін у мяне і застаўся.*
***(З пачутага)***

І ў мяне таксама адзін.
Мы спавітыя адным годам,
Як тыя блізняты.
Ён — хударлявая строма,
Я — каржакаваты валун.
Жылі, вучыліся разам,
Прыглядаліся адзін да аднаго.
Раз за разам —
Зрасліся душамі,
Думкамі, словамі, справамі,
Віном, шпротамі.
Хваля за хваляй
Эмоцый:
Смеху — мех.
Гаварылі мы, гутарылі —
Аж жываты трашчалі
Ды балелі сківіцы
Суткамі.
Разуменне з паўслова,
З напаўслова —
Жыццё спрашчалі,
Як мову.

Не даравалася —
Параскідала, паразвозіла,
А мары засталіся,
Чыстыя, як вада калодзежная.

...Бэйбусы дурнаватыя,
Рагочам, хоць бы хто рот залатаў.
Не сварыліся ж ніколі —
Вось дзіва!
Разам не плакалі.

Жывём і цяпер па-старому —
Не перайначыш нас,
За лейцы жыццё бярэм
Найвыкшталцонымі старастамі.

## ВАГОНАВАЖАТЫ

Вагонаважаты
Анучу згубіў
У трамваі,
І чырванню свеціць яна
На падлозе.
Цяпер
Яго годнасць і гонар
Топчуць нагамі натоўпы,
А вагонаважаты,
Бы голы акунь,
Хаваецца з ранку ў вёсцы.

## ВІЦЕБСКІ ТРАМВАЙ

Пачакай... Я матляўся
Па рэйках чужых,
Я знямогся, шукаўшы
Вагон на дваіх.

Беларускім вакзалам —
Дэпо маіх мрой,
*Тысяч слоў* не хапала
Мне побач з табой.

Ў заінелых далонях
Трымаю свячу,
Праз вагоны па гонях
Лячу і свячу.

У куце маіх думак
Трапеча пагляд...
Я застыў, я — малюнак,
Ні кроку назад!

## ТРАМВАЙ У ЧАСЕ ПІК

*Ю. К.*

Паўзе паўзамі,
Раз-пораз спыняецца,
Торкнецца пысай,
Раздумвае.
Трушчацца людзі
Ненароджаныя,
Скуголяць немаўляты,
Праклінаюць сябе
Старыя бабулі,
З сівымі куклямі
І лупатымі лялькамі
На руках.
Кіроўца
Здранцвелы сядзіць,
Цісне ў адчаі
На тормаз —
Чалавек на дарозе ж,
Спыніцца б
Патрэбна...

...Тормаза цвік
У пустэчу ляціць,
Хада не сціхае,
А людзі
Не вераць
Падскоку трамвая...

* * *

Дзе твая дабрыня і тваё хараство,
І сангвінік, хто словам не скупіцца,
Непасрэднасць, чароўнае рамяство
І ўсмешка, што крыўду адлупіць?

Цемната, агарнуўшы і шыю, і плечы,
Стала колерам вельмі насычаным.
Не стрымаць, не спыніць, а смяяцца і бегчы
Сем стагоддзяў таму і сёння ўвечары.

* * *

Ў каромысле: праца, каханне і боль —
Рыштункам бабуліны плечы кляне;
Аўтобус вачыма прасвечвае золь,
Старая трапеча: ну, мо' не міне?

На плечы налёгшы, дугою віецца
Драўляны вяршнік. Кожны ўзяць хоча бок
Нямоглай кавалачак хворага сэрца.
Маліся ж, бабулька, маліся ж, дальбог...

Не ўбачыць цябе кіроўца вяльможны,
Не спыніць машыну і шклом не зграбе.
Праедзе, і будзеш ты лёгка, заможна
Аб негаблёванай марыць труне.

Твой ссохлы шкілет не матляюць калёсы,
Каромысла з плечмі зраслося наўзрыд —
Стрываць немагчыма! Укленчыш ты слёзна
Камусьці; ды позна: мінула усё — нябыт.

## ГЛІНЯНЫ ЧАЛАВЕК

Зноў-ткі Канчэўскі Ігнат нам узгадваецца — сутыкаемся з формай свабоднай — ад невыяўнага ў бок мы адыдзем, паспрабуем наблізіцца да прадмета канкрэтнага, гліны.

Усе людзі стварыліся з гліны, ды толькі чамусьці кароткае наша імгненне — жыццё — заганяем у форму: рабочы і творца, мастак і палітык — усе мы ў межах.

І калі чалавек выбіваецца з формы, на яго як на талент глядзяць, ці не больш, і ўсе ўсхваляюць яго.

Але смерць зноўку робіць свабодным і зноў нас вяртае да формы спрадвечнае, гліны.

Нараджэнне і смерць — чалавек паміж імі, і лёс яго колу падобны; і ён — чалавек — замыкае яго, разрываецца кола жыцця і знікае, калі чалавек выпадае з яго.

Разрываецца кола, калі чалавек пачынае шукаць у сабе палавыя адзнакі: ці мужчына, жанчына, ці наадварот — усё роўна ягоная існасць застаецца адзінай. Бо з гліны ён вырас, якая жанчына па назве, па форме, па змесце. Але ж гэта адно: спачатку жанчына ідзе, а потым мужчына, і часам змяняецца іх першынство, фаварытаў няма — ёсць кола, якое нітуе страла і ў адзінае звязвае іх.

Глінянае кола, як кола, дзе бусел наверсе, і вянок па рацэ, і прыродны зварот — гэта форма не стыне ў печы, бо яна як жанчына.

Лепім з гліны жанчыну, з пяску ля ракі выляпляем, просім з неба натхнення і месім нагамі асфальт.

Чалавек замыкае сабою сябе і стварае сябе, нібы гліна.

* * *

Пілавінне жалезнае горкай расце
на падлозе майстэрні;
аб наждачны камень ходзіць нож —
чалавечыя рукі спраўна працуюць;
гэта справа святая,
яна пачынае свет з ранку і месяц саджае на неба;
Міхасёк — ён дажыў да сівой галавы,
да ўнукаў, ён на пенсіі, з жонкай жыве і гадуе карову;
ён заняты — ён точыць свой нож кожны дзень.

## МОЦ

У куце стаіць стары аблуплены ложак,
Збіты з дошак магутнае некалі ліпы,
Габляваных у майстэрні нябожчыка дзеда.
Гэта — цэнтр жыцця,
Галоўны яго элемент:
Ці нараджэнне, каханне, ці смерць,
Сон — трэцюю частку існавання —
Або які іншы сусвет
Уявіць немагчыма без ложка,
Стварэння мудрасці продкаў.

І цяпер,
Ламаючы струхлелыя дошкі
І аддаючы пашану,
Грэюся цяплом старое грубкі,
Якую некалі выклаў прадзед.

* * *

Ноч зімовая вэльмам зямлю ахінула,
Квадра поўні шчарбатая сквапна мігціць.
Цішыня на зямлі — ўсё навокал паснула,
Толькі плёс ленавата паўзе-шапаціць.

Абымшэлая кладка змярцвела над плынню,
Спарахнелыя дошкі цалуе вада.
Ступіш крок — і сустрэнешся з воднаю сінню:
На ўспамін застанецца толькі жуда.

Беларусь, я прайду праз усе перашкоды —
Хай лютуюць завеі зімовых начэй
І нацкоўвае зграі віхор, з асалодай
Выразаючы зрэнкі гарачых вачэй.

Я не кіну цябе, замярзаючы ў твані,
Падымуся й паклыпаю далей праз змрок,
Бо зямлі тваёй жывіць святое дыханне,
Несучы праз стагоддзі мацункавы клёк.

Ён абудзіць агонь у грудзях маіх кволых
І прымусіць змагацца з калючым жыццём,
Дасць падтрымку душы, ачарсцвелай і голай,
Ды паможа застацца ўдзячным дзіцём.

## ЗАКАХАНЫЯ Ў СНЕГ

Яны любяць гуляць па гурбах
І правальвацца па пояс,
Выцягваць адно аднаго,
Дыхаць халодным паветрам,
Кідаць камякамі снегу.

Яны закаханыя ў снег.

* * *

Рубероідавыя дарожкі
Заслала зіма.
Едзем: Капыль—Мінск—Маладзечна—
Валожын—Вілейка.
На сцежках,
Глейкіх, як недасмажаная яечня,
Некранутыя елкі.
Я набраў атраманту ў лёгкія —
Рознага колеру:
Сіні, жоўты, чырвоны —
Я мастак-лесавік,
Я пакінуў поле даўно —
Сын яцвягаў, унук Перуна —
Малюю іконы.

Бязлюдныя плошчы —
Над брукам асфальт —
Між лясоў раскіданыя.
Я, словаў каваль,
Пад сонцам зімовым іду
Дарожкамі рубероідавымі;
Легіёны вошай вакол
Выглядаюць з дзотаў
Іголкамі.

Елкі-сябры
Сваімі рукамі пяшчотнымі
Прымаюць іконы ў дар,

Не даюць гаварыць
Удзячнасці словы,
З усмешкай
На грудзі сабе
Іх вешаюць лоўка,
Як скарб.
І іконы
Уздоўж рубероідавых сцежак,
Рэчак, ільдом не пакрытых,
Дарог са слядамі вашчыны,
Лёхаў падземных,
Над якімі вісяць,
Ажываюць, смяюцца
І ў сцюдзёным паветры
Гараць.

## 2008

Стаіць стракатая елка
Нон-беларускай культуры —
І для кагосьці ёсць золкам,
А для кагосьці — хаўтурамі.

Няўрымслівы карагод
Папраўдзе смяецца заўзята.
Дзве тысячы восьмы год
Пачнецца, прынамсі, як свята.

...У першабытным маўчанні
Прачнецца краіна першага.
Застогне хтось у каханні,
А хтосьці разродзіцца вершыкам.

А потым суцэльна год,
На гэты раз — пацуковы,
Спакойны святочны народ
Нервова гуляе ў сховы.

* * *

Уцякае старэча-зіма,
Па асфальце скрыгочучы мыліцай.
На сухоты хварэе яна
І пайсці не жадае — ўсё мыліцца.

Пасіпяць, зазлаваўшы, снягі,
Сонца скокне з нябёс у калюжыну.
Не праспект, а рака: берагі —
Тратуары, якія звужваюцца.

Дык схапі памяло, сакавік,
І хвашчы, як у лазні венікам!
Галашэнне апошняе крыг
Занатую ў «Зімовым спеўніку».

Кропкі кропелек пояць зямлю
З капяжоў — на цымбалах гранне;
Смецце чорнае ранкам палю
Я на першым з вясной спатканні.

## ДАХАТЫ

Вайна не дыхала ў карак мне,
І ад уцёкаў дзікіх не стаміўся;
Свой лёс цугляў і, як у нейкім сне,
За шчасцем зманлівым узвіўся.
І паляцеў. Дом скрыўджана глядзеў
Вачыма сіраціны-немаўляткі.
Счарнелі сцены, быццам ён калеў
(А ён чарнеў ад цяжкіх думак маткі).
І лета бабіна паблякла на вачах,
Халодным сіверам падрэзваць стала крылы.
Кадык каменны замаруджваў ўзмах,
І голас — ледзь пачуць: «Вяртайся, мілы...»
Нашто прасіць? Свой нораў у яе —
Тугі свавольнай па радзіме.
І калі моцы болей не стае,
Прыцісне у грудзях — дык шлях адзіны:
З шашы страката-тлумнай і глухой,
Змарнеўшы ад жыццёвых кпінаў, збочу,
Атаву ссохлую прасуючы нагой,
Каморнікам найпрагнейшым пакрочу.
Паспешліва прайду праз рунь,
Затым гасцінцам, напрамкі праз ляды,
Счакаўшы хвілю доўгую ля пуні,
Ўвалюся аб'інелы пад Каляды.
Дом зварухнецца і лагодна крэкне,
Матуля вылеціць у калідор.
Абдымкі. Бацька за руку патрэпле.
Гаворым. На патэльні пыршча здор.

# ВЯНОК У РУКАХ ПАВІТУХІ

Чорнымі стужкамі
Рукі вянок аплятаюць,
Белыя літары
Шчыра ад сэрца
Галосяць.
Коціцца ён праз метро,
Чалавечыя зграі,
І ля вянка, як ля хворага,
Носяцца.
Хлопчыкаў сорак
І сорак дзяўчынак
Праз яе рукі,
Ад бульбы шурпатыя,
З мяккімі пальцамі,
Воцатам пахкія,
Сцёртымі рыскамі
Цёплых далоней
Прайшлі.
Да свайго першынца,
Летам абранага,
Званага, гнанага,
Хлопчыка ранняга,
Лёсам згулянага,
Цяжка бяжыць.
Хлопчыкаў сорак
І сорак дзяўчынак —
Мяжа;
Тая, хто коціць вянок,
Перастала раджаць.

## ДЗЕНЬ-НОЧ САКАВІК

Сакавік зухавата прачнуўся,
Рэшткам грыпу паддаў кухталёў,
У прагаліны скрозь апрануўся,
Ручаінай журчыць між палёў.

Спеў птушыны лагодзіць прастору,
Сонца промні і неба блакіт —
Калі з раніцы ты не ў гуморы,
Кінь свой дрэнны настрой у нябыт.

Пабудуй у нябёсах вясёлку,
Ёй, стракатай, сягай далячынь.
Бы мастак які пэндзлем — рукамі
Расфарбуй падвячэрнюю сінь.

І няхай веснавое надвор'е
Надае адпаведны імпэт.
Ўвесну ж блізкімі робяцца зоры
І цяплейшым — далёкі сусвет.

## 8 САКАВІКА

На асфальце маім любімым,
На плямцы асфальту,
Што пасярод поля,
Мохам выбіта лічба «8».

## ТРЫО

1

Мужчына са слоікам і драўляным кіем,
Пажылы, нявыспаны, твар у маршчынах,
Злез з прыступкі аўтобуса ля поля.
Купкі, трыснёг, восень, чарната...

Утыкае кій у зямлю
І цягае з канавы ваду:
Першая справа ў яго жыцці.

2

Дзяўчына з часопісам «Environment health»
Ратавала ваверку.
Яна бачыла стук яе сэрца:
Маленькія вочы-разынкі,
А ў іх — сабакі, ваўкі, ногі і поўсць...

Толькі часопіс колеру душы
Шапацеў лістамі ў траве.

3

Чатыры бабулькі з валізкамі і клункамі
Перад жывой шашой.
Святлафор чырванее,
І дзве не зважаюць на колер —
Ідуць. Пад машыны.
А дзве застаюцца чакаць...

Чатыры бабулі.

## ХРЫЗАНТЭМЫ Ў ДАЖДЖЫ

Я іх нёс пад гару.
Пазнаёміцца — справа няхітрая,
І далонь, нібы дах, над бутонамі.

Затрымайце, — прашу
Двух архангелаў з царства Дзімітрыя, —
Заблукайце туману сутоннямі.

Кальцавая будоўля-пятля
За спіной. Паглядзіце уздоўж:
Гэта ён, хрызантэмы,
Знаёмцеся — дождж.

* * *

Хруснула;
Пад столь цяжкую падэшвы
Патрапіў.
Ён бег, шаргацеў па асфальце,
Ён быў басанож,
Спадзяваўся на добры пагляд,
Хаця б на маўчанне, —
Пажоўклы кляновы лісток.

## ВЕРУЮЧЫЯ ДЗВЕРЫ

Іх шукаць будзеце вы
У касцёле, царкве,
На могілках лясных
З нябачнымі словамі.

Выйсце ў лепшы свет —
Пра яго я чуў
Ад людскога гора
І слёз пляцакоў.

Для некага дзверы — вокны,
Для некага — Windows,
А я знайшоў свае
У лістоце кляновай.

«Як так?» — спытаеце вы.
Не пытайцеся,
Дачакайцеся восені.

## ПРОСЬБА ЗРУЙНАВАНАГА ДОМА

### 1

«Я, як кожны амаль трохпавярховы дом гарадскі,
Люблю, калі гуляюць галубы
Па маім даху.
Пужаю іх,
Бляхай бабахну.
Ірвануцца ўвышкі, —
Зляцяць на зямлю,
Як «Узвышша».

### 2

Ліфт мне спаць не дае ўначы.
І ўдзень па вантробах маіх
Яму соўгацца файна.
Я стаю паўстагоддзя:
Скрыжаванне Караткевіча-Маркеса.
Я спачатку сачыў,
Што ліфту даспадобы:
Расчыняць свае дзверы,
Запальваць святло,
Рухавік заводзіць.

3

У кватэрах маіх спакой.
Люстры свецяць,
Дываны пылам дыхаюць
У залах.
У калідораў сутоннях
Малюнкі на сценах,
На іх — ка́лы.
Сохнуць на падваконні
Крохкія азаліі.

4

...Я жыў, як умеў,
Як было зададзена мне,
Мы браты: я і камень.
...Экскаватар дзёўб
Наводліў,
Крышыліся сцены,
У пыл — азаліі,
Дываны скурчыліся скурай,
Што дэ Бальзак фарбаваў.
Ка́лы аскепкамі,
Галубы — у небе,
Мой лёс не з лепшых:
Мой дах пластылінам
Птушыным аблеплены!

Шахта ліфта аголеная,
Тоўсты провад —
Струмень —
Расшчэплены,
Распаўзаецца ў бакі
Каляровымі жыламі,
Люстра бліскучая моліцца:
«Пажыць бы!..»
Мы браты: я і камень.

5

Я не жывы і не мёртвы,
Я стаў дробнымі часткамі.
Груды цэглы з цэментам,
Ліфт на іх варушыцца.
Я быў цэлым — цяпер парушаны.
Тысячы і мільёны
Каменьчыкаў сцёртых
Месца займелі
Змушана.

6

Па дратах
Калючых і скурчаных,
Падабраўшы дзверы,
Ліфт з'язджае замучаны
На адным баку,
Паціху, не павернецца.
Ліфт, паслухай!
Ты нястомны, няспынны,
Раскажы пра яго,
Пра свой шлях,
Перад печчу завода,
Раскажы, раскажы...»
«Не хвалюйся, згода...»

* * *

Спяць твае валасы на шкле,
Верхаводзіць апоўдні дождж.
Я свой позірк нібыта паклаў,
Трымаюся, яшчэ ненароджаны.
Лямпы няма, шапаціць
Апалае лісце душы;
Непрыемна, пэўне, ляжаць
Ёй на цвёрдай падушцы.

* * *

Ты прыгожая, як ружа,
Як жанчына без мужа,
Як у дойліда хата
І гісторыя без латаў.

Ты стаіш, як бяроза,
Снежна-марозная,
З вачыма вялікімі,
Што за сабой клікаюць.

З тварыкам дзіцячым,
Жыццём пакамечаным,
Актуальнымі вуснамі
І позіркам вусцішным.

З выглядам незалежным,
Важным і няспешным,
Са спакоем Айчыны
Ды цнотай дзяўчыны.

## ФУТУРЫСТЫЧНАЕ

Па чарнобыльскай па зоне
Ў шэранькім камбінезоне,
Лес мінаючы дубовы,
Скача зайчык трохгаловы.

На імшару слінай пыршча,
З ноздраў белай парай свішча,
Вочы чырванню наліты —
Пэўны цмок з якога міта.

Ён кіруе да мястэчка,
Каб знайсці там чалавечка,
На двары ў гумне прысесці,
Мяса свежага паесці.

## ЦЫКЛ

Хтось вечна шукае кветак
На рынку, у садзе, на полі,
Жывых, арганічна прыгожых,
Прывабных і стромкіх даволі.

Заўсёды зрывае найлепшыя,
Купляе без слоў у гандляркі,
Калі патрэбна — крадзе,
Патрэбна — плоціць далярамі.

Пяшчотнай далоняй абхоплівае,
Павольна ідзе дадому,
Мінае паркі і скверы,
Не заўважае знаёмых.

Прыйшоўшы, ставіць у вазу,
Сядае ў фатэль, назірае
І думае кожнага разу,
Як лёс прыгажосць карае.

З напругай чакае той момант,
Як зваліцца першы пялёстак,
Што йдзе на покліч прыроды,
Гармонію бурачы проста.

...І ўскоквае, ломіць сцябло:
Адно, другое і трэцяе;
І кветкі ляцяць праз акно
У сметнік, з пылком на суквеццях.

## АСІРАЦЕЛЫЯ ЎВОСЕНЬ

Жырандолямі клён разлапісты
Лістападу аблокі прасвечвае;
Безнадзейныя, вечна васаламі,
Ліхтары ў дзве шарэнгі свечкамі.

Піск машын, галасы натужліва —
Адгалоскі ад святаў вуліцы, —
Так самотна галлё незамужняе
У бясколерным небе муліцца.

Альпіністамі гмах наведаўшы,
Алюмініева мёрзнуць антэнчыны,
І драты, ўдзень звычайна бяздушныя,
Перад ноччу скуголяць нечага.

## СНЯЖЫНКІ І СЛУП

Вежы Таронта і Масквы
Ганарліва спяць і не ведаюць
Пра цябе,
Мінскі слуп
Ля крамы «Прадукты».
Ты марыў пра неба,
Імчыш насустрач снегу,
Мокраму ў лістападзе,
А сняжынкі вераць
У сілу зямлі.

* * *

Цяжка глядзець на мапу,
Зямную кулю прабіць бы наскрозь:
Па два бакі Атлантыкі
Ёсць жывыя хтось.

Тваё словы, што твае вочы, —
Пяшчоты хвалі!
Статуя Свабоды сочыць
У аблоках-каралях.

Амерыка Маякоўскага —
Меркантыльны дух,
Паглядзі на дзяўчыну-сонца,
Што свеціць за двух!

Кабель варушыцца
На дне акіяна;
Я, словаў каваль,
Пішу адной, Пані!

## МІНСКАЯ ТЭЛЕВЕЖА

Кудзелістыя аблокі плывуць, таючы,
Над тэлевежай у цэнтры Мінска.
Ты — не Астанкіна, не 500 пад табой,
І не Пізанская, што падае ніцма.

Ты ўзнялася не вельмі высока,
Але стаіш і не нізка:
Пэўна, мінскія аблокі
Зачапіць была рызыка?

Мінская тэлевежа
Стрымана-сталёвая.
Былі межы — не стала межаў,
Лёгка як, лёгкія!

Мы з табою ў адзіным танцы.
Як стагоддзі таму, як калісь,
Беларусам нялёгка звацца...
Вежа! Увышкі імчыся!

Неба гэта — тваё і маё,
І такія ж плывуць аблокі,
І ў кожным ты зробіш раллю,
Уздоўж Свіслачы ўзяўшыся ў скокі.

## ПЕРШАЕ ВЫМЯРЭННЕ

Сто паверхаў у неба
Са шкла і бетону —
Біржа, офісы, банк.
Людзі лічбай з нулямі
Шнуруюць штодзённа
У гмах.
Каля гмаха — каровы,
Зялёнае поле,
Касцы.
Тры дубы, тры бярозы,
І ровар застыў.
Пры дзвярах механічных
Ахоўнік са стрэльбай
Глядзіць:
Баба доіць карову,
За пазухай Буда
Сядзіць.

* * *

Я хачу глядзець на цябе
Кожную раніцу;

Я — паранены!

* * *

Дрэва на праспекце,
Колькі бачыш ты
Людзей сумных і вясёлых,
Вачэй злых і хлуслівых,
Усмешак розных...
А ці ўбачыць хто цябе?

* * *

Сабака на плюшавых лапах
Шчасліва ловіць пакет;
Сярпянкай няўлоўнай
Кусок цэлафану
Гуляе з сабакам.

## ДУША ЧАЛАВЕКА

Калі іржавілася лязо,
А ты быў стомленым вершнікам —
Уверх галавою неслася
Твая душа, і сядзела на вежах.

А потым саскоквала ўніз,
Люляла-суцішвала сэрца,
А ты заставаўся паміж
Новым жыццём і смерцю.

* * *

Мне прыснілася поле кветак
У ліпеньскім яркім дні.
Белы, складзены з белай газеты
Карабель абмінае мяне.

Ён пакінуў бераг турэцкі
І прыплыў у свой родны кут.
Мне вядома, хто быў газетчык,
Што адправіў яго ў маршрут.

Калі ж ветразь надзьмуў свае грудзі,
Карабель хутка рушыў далей.
Кветкі поля — крывіцкія людзі
Праводзілі мой карабель.

* * *

Што кажа лета пачатак
Спякотным днём ці лагодным вечарам
Табе, крывіцкі нашчадак,
Пад сонцам, якім ты ўжо трохі падпечаны?

Напэўна, пра вечнасць жыцця,
Пра бяскрайнасць палёў і бяздоннасць неба.
Птушыныя спевы ловіш ты не для багацця —
Бо не схаваеш спевы да снегу.

Лета — як сёння,
Якое ўжо не паўторыцца,
Як імгненне, калі ён і яна
Становяцца творцамі.

Летняя раніца россыпам кропель поіць нас
З далоняў сваіх.
Бачыш, як соладка мроіць нам
І быць кожнаму — за дваіх!

...І перакуліцца чэрвень дагары нагамі,
І беларусы пакрыюцца бронзай.
Летам магчыма пагута́рыць з багамі —
З нашымі, з іхнымі, з рознымі.

## СВЯТА КАМБАЙНЁРА

Камбайнёры нажамі-брытвамі
Залатое бязмежжа дояць:
У паласу густую ўблытацца б
І плыць па ёй, непаголенай!

Каласы пагалоў пад корань!
Каб не віслі над полем, не веруючы:
Лёцьма едзе машына па ворыве,
Перашкоды ірве, як паперчыны.

Экіпаж пасля працы па-брацку
Перад небам на золку вячэрае.
Не патрэбны сто грам салдацкія:
Поле хмеліць сваёй бязмернасцю.

## ВЕЧНАЗЯЛЁНАЕ СМЕЦЦЕ

Падарункі пад арку
Павыкідвалі людзі з акон,
У калюжу налілі салярку,
$CO_2$ напускалі ў азон.

Бульба з пахам алею
Смокча «Колу» ў кутку,
Рэшткі месяца Вадалея
Вісяць на круку.

* * *

Кропля дажджу прабегла па шкле электрычкі,
Вецер крутнуўся й пабег у яе пад вагонамі,
І электрычка шляхам няспыннае звычкі
Зноў паімчала па беларускіх гонях.

Хуткасць, і вецер, і дождж, і нядоўгія перадыхі,
Рэйкі гулліва звіняць, ім уголас — пагорак.
Змяшалася: чэрвеньскі пах — электрычныя сполахі-ўспыхі,
Бэз, што адцвіў, і неба, што мора.

Яна — электрычка — штораніцы шлях пачынае,
Да канцавога ж прыпынку не даімчыць ніколі,
І кожны вагон, нібыта блакітная хваля,
Бывае, стамляецца, шэпча: «Даволі...»

А на прыпынку, часова канцовым,
Суцішваючы стамлёныя мышцы,
Яна ўсміхаецца добраму хлопцу,
Шчыра-спагадліваму машыністу.

* * *

Слупы ідуць па вадзе,
Без спешкі, нязмушана,
След у след.
І маладыя,
І сонцам ссушаныя,
Ідуць слупы па вадзе.
Не абгоняць іх машына і вецер —
Раз, два, тры,
Праз дарогі, скрозь мхі,
Удзень і ўвечары
Ідуць слупы.
Пяць, шэсць, сем,
Чацвёрты маланкай пабіты,
Вісіць на дратах нацягнутых,
Ад ветру трымціць
Над жытам.
Восем, дзесяць — мільён:
Рукапоціск штодзённы;
Гучыць
Штовячэрні дратоў пераразвон.

* * *

Цягнік ідзе напрасткі,
Гудзіць са смакам,
Загарае на сонцы
Чыгунка.
У вагонах — сям'я машыніста
Глядзіць на абсягі:
Кот, карова, свінчо,
Дзеці ды жонка.
Уздоўж дарогі
Мірныя хаткі —
Станцыя «Барсукі»
Глядзіць на цягнік,
Нібы азіятка,
Прыжмурыўшыся,
З-пад рукі.
У «Барсуках» сёння свята —
Базарны дзень,
Партыя беларускіх аматараў
Точыць крэмнем камень.
У Смалявічах пыляцца дошкі
Аж да Загор'я...
Гэй, чыгунка, павярніся ты шчэ
Да Балтыйскага мора!
Там салёныя людзі
Носяць каўшамі ваду,
І там салёная хваля
Змывае нуду.

## АЛЯКСЕЙ ЧУБАТ

нарадзіўся ў 1979 годзе ў Вілейцы. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (аддзяленне піяру), вывучаў эканоміку і кіраванне вытворчасцю ў БДЭУ. Працаваў журналістам у газеце «Мінская праўда», часопісе «Дырэктар», упраўленні інфармацыі ААБ «Беларусбанк». У 2004 годзе з мэтай вывесці беларускі PR у Інтэрнэт заснаваў з паплечнікамі першы ў Беларусі PR-партал APRэль (www.april.by). Напрыканцы 2006 года на яго базе было створана PR-агенцтва APRэль (www.april.by/agency).

Першы верш Аляксея Чубата быў змешчаны ў газеце «Наша Ніва» ў 1996 годзе. Друкаваўся ў часопісах «Маладосць», «Першацвет», «Крыніца», газетах «Літаратура і Мастацтва», «Голас Радзімы» і іншых. Адзін з аўтараў калектыўнага зборніка «12+1» (2004).

Выступае ў друку і з прозай. У 2005 годзе на конкурсе газеты «Звязда» і Саюза беларускіх пісьменнікаў атрымаў прэмію за апавяданне «Гісторыя банта».

# ЗМЕСТ

*Анатоль Вярцінскі.* Якія кветкі шукаем... ...... 5

***Тыдзень дарогі праз паў-Беларусі... .......... 9
*** «Малая радзіма»... .......................... 10
***Белыя плямы кефіру... ........................ 11
Пленэр.................................................. 12
Брэсцкія каштаны.................................. 13
Развадны ключ і каштаны........................ 14
Правінцыйная восень............................. 15
***Такі халодны дзень... .......................... 16
Вяртанні............................................... 18
Пошук.................................................... 19
***І ў мяне таксама адзін... ...................... 20
Вагонаважаты........................................ 22
Віцебскі трамвай.................................... 23
Трамвай у часе пік................................. 24
***Дзе твая дабрыня і тваё хараство... ......... 25
***Ў каромысле: праца, каханне і боль... .... 26
Гліняны Чалавек.................................... 27
***Пілавінне жалезнае горкай расце... ......... 29
Моц...................................................... 30
***Ноч зімовая вэльмам зямлю ахінула... .... 31
Закаханыя ў снег.................................... 32
Рубероідавыя дарожкі............................ 33
2008..................................................... 35
***Уцякае старэча-зіма... ........................ 36
Дахаты................................................. 37
Вянок у руках павітухі........................... 38

Дзень-ноч сакавік ........................................ 39
8 Сакавіка ........................................ 40
Трыо ........................................ 41
Хрызантэмы ў дажджы ........................................ 43
***Хруснула... ........................................ 44
Веруючыя дзверы ........................................ 45
Просьба зруйнаванага дома ........................................ 46
***Спяць твае валасы на шкле... ........................................ 50
***Ты прыгожая, як ружа... ........................................ 51
Футурыстычнае ........................................ 52
Цыкл ........................................ 53
Асірацелыя ўвосень ........................................ 55
Сняжынкі і слуп ........................................ 56
***Цяжка глядзець на мапу... ........................................ 57
Мінская тэлевежа ........................................ 58
Першае вымярэнне ........................................ 59
***Я хачу глядзець на цябе... ........................................ 60
***Дрэва на праспекце... ........................................ 61
***Сабака на плюшавых лапах... ........................................ 62
Душа чалавека ........................................ 63
***Мне прыснілася поле кветак... ........................................ 64
***Што кажа лета пачатак... ........................................ 65
Свята камбайнёра ........................................ 66
Вечназялёнае смецце ........................................ 67
***Кропля дажджу прабегла
па шкле электрычкі... ........................................ 68
***Слупы ідуць па вадзе... ........................................ 69
***Цягнік ідзе напрасткі... ........................................ 70

Літаратурна-мастацкае выданне

Другі фронт мастацтваў

**ЧУБАТ** АЛЯКСЕЙ ЛЕАНІДАВІЧ

# ГЛІНЯНЫ ЧАЛАВЕК

Вершы

Адказны за выпуск Уладзімір Гніламёдаў
Рэдактар Наталля Кучмель
Дызайн вокладкі Сяргей Ждановіч
Вёрстка Сяргей Кандрацeнка
Карэктар Наталля Кучмель

На вокладцы выкарыстаны дыптых
Ганны Коўшар «Брэйк».

Інфармацыйная падтрымка галерэі «Подземка»
(podzemka.org)

Падпісана да друку 18.08.2008. Фармат 70×100 1/32.
Папера афсетная. Гарнітура «Mysl». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 2,3. Ул.-выд. арк. 1,0. Наклад 500 асоб.
Замова № 347

Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Галіяфы».
ЛИ № 02330/0150300 ад 08.04.2008 г.
Вул. Брылеўская, 11—44, 220039, г. Мінск.
E-mail: vish@bk.ru
www.goliafy.com

Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медисонт».
ЛП № 02330/0056748 ад 22.01.2004 г.
Вул. Цімiразева, 9, 220004, г. Мінск.

Кніжная серыя “Другі фронт мастацтваў” заснаваная ў 2000 годзе суполкай радыкальных літаратараў “SCHMERZWERK”:

**За 8 гадоў выйшлі кнігі аўтараў:**
Альгерда Бахарэвіча, Юрася Барысевіча, Адама Глобуса, Вальжыны Морт, Алеся Бычкоўскага, Сяргея Кавалёва, Змітра Вішнёва, Іллі Сіна, Вікі Трэнас, Вольгі Гапеевай, Валянціна Акудовіча, Віктара Жыбуля, Джэці (Веры Бурлак), Пятра Васючэнкі, Міхася Башуры, Ірыны Шаўляковай, Уладзіміра Боські, Ганны Кісліцынай, Людкі Сільновай, Сэмюэля Бэкета (пераклад Віталя Воранава), Андрэя Бурсава, Андрэя Хадановіча, Леры Сом, Усевалада Гарачкі, Дзяніса Хвастоўскага, Андруся Белавокага, Змітра Пляна, Юр’я Станкевіча, Арцёма Кавалеўскага, Таццяны Нілавай.

**Выдавецтва «Галіяфы» рыхтуе да друку (2008 — 2009) наступныя выданні.**

**Серыя «Другі фронт мастацтваў»:**

– **Валянцін Акудовіч.** «Дыялогі з Акудовічам». Размовы, дыскусіі, рэфлексіі і палемікі;
– **Аляксей Талстоў.** «Бег». Раман;
– **Аляксей Талстоў.** «Мінакі». Раман;
– **Пятро Васючэнка.** «Ад тэксту да хранатопа». Артыкулы, эсэ, пятрогліфы;
– **Пятро Васючэнка.** «Піраміда Ліннея». Бестыярый;
– **Мікола Касцюкевіч.** «Колеры». Паэзія і проза;

– **Юрась Пацюпа**. «Зялёны яблык». Тэксты, інтэрпрэтацыі, каментары;
– **Зміцер Плян**. «Фрагмэнты закаханага». Паэзія;
– **Алесь Туровіч**. «АКТ». Маніфесты, артыкулы, эсэ, даклады;
– **Ілля Сін**. «Тэатральныя дэманы». Кніга трансгрэсіўнай прозы;
– **Ілля Сін**. «Ці баліць папяроваму чалавечку?». Проза;
– **Міхась Башура**. «Стойкі алавяны ваяка». Вершы і проза;
– **Зміцер Вішнёў**. «Замак пабудаваны з крапівы». Проза;
– **Юрась Барысевіч**. «Ілюмінацыі». Афарызмы і мініяцюры;
– **Юрась Барысевіч**. «Шэрае сонца». Доследы літаратурна-мастацкага андэграўнду;
– **Віка Трэнас**. «Лабірынт». Крытыка;
– **Вольга Гапеева**. «Непараўнальная лінгвістыка. Асновы». Проза;
– **Інэса Кур'ян**. «Бэзавы бамжак». Раман;
– **Ірына Шаўлякова**. «Сапраўдныя хронікі Поўні». Артыкулы, эсэ;
– **Міхась Южык**. «Баль на канаце». Крытыка;
– **Віктар Ываноў**. «Асарці». Проза, п'есы, паэзія;
– **Анка Упала**. «Каворная сьвішнасьць». Казкі для дарослых;

– **Віктар Жыбуль.** «Стапэліі». Вершы;
– **Віктар Жыбуль.** «Дзяцел і дупло». Вершы;
– **Вера Бурлак.** «Дзеці і здані». Вершы, апавяданні, п’ескі;
– **Андрэй Федарэнка.** «Сечка». Эсэ;
– **Уладзімір Гніламёдаў.** «Паэзія: набыткі і тэндэнцыі». Навуковыя даследаванні;
– **Сяргей Кавалёў.** «Пачвара ў рэліктавым лесе». Крытыка.

**Серыя «Адсутнае беларускае мастацтва»:**

– **Алесь Родзін.** Каталог рэпрадукцый;
– **Пятро Васілеўскі.** «Рэтраперспектыва». Артыкулы, эсэ;
– **Віктар Жыбуль.** «Жыцьцяпіс беларускага футурыста». Дакумэнтальны нарыс пра Паўлюка Шукайлу.

**Серыя «Калекцыя беларускай фантастыкі»:**

– **Серж Мінскевіч.** «Сад замкнёных гор». Квазіфэнтэзі;
– **Алесь Бычкоўскі.** «Анамалія». Фэнтэзі.

Серыя «Партрэты польскай літаратуры»:

– **«Вертыкальны трыпціх»**: Польская авангардная паэзія (пераклад І. Кур'ян).

Дзіцячая серыя «Сланечнікі»:

– **Алан Аляксандр Мілн.** «Файны Пуф і ўсе, хто з ім» (пераклад з англійскай І. Кур'ян);
– **Алан Аляксандр Мілн.** «Паветка на Пуфавым узлеску» (пераклад з англійскай І. Кур'ян).

ВЫДАВЕЦТВА
ГАЛІЯФЫ

ISBN 978-985-6906-09-4
9 789856 906094



ДФМ

Аляксей Чубат

ГЛІНЯНЫ ЧАЛАВЕК